# Чэрвень

**1/19.** Людзі прыкмячалі: калі ў першы і другі дзень чэрвеня лье дождж – увесь месяц будзе сухі (Санько, 1990).

**2/20. Тры Мучанікі**. Пра дзень памяці хрысціянскіх пакутнікаў Фалалея, Аляксандра, Асцярыя (каля 284 г.) у нас замацавана прыкмета «Да Трох Мучанікаў – заледзянелых старцаў – няма лета, але пасля іх не бывае зімы» (БГ, 1943).

У рускіх гэты дзень больш звязаны з агуркамі, таму прысвятак і называюць «Фалалей Огуречник», «Фалалей Тепловей» (Усаў, 1997).

**3/21. Алёна (Алёны, Ульяна) –** дзень ільну. Лічылася: як пасеяць лён на Алёну (Ульяніцу), то добры «удасца» (Пяткевіч, 1938; Дамбавецкі, 1882). У Бельскім павеце Смаленскай губерні зафіксавана: «Лён хто пасеіць на дзісятый ад Іллі нядзелі – са льном; а на восьмый – у васьму (атрымае восьмую частку) – на сёмый – із поля вон» (Дабравольскі, 1894).

Вось як апісвалі фалькларысты ў пачатку XX ст. абрад сяўбы: «Сяўба лічыцца асабліва ўдалай, калі гэты дзень прыпадае на панядзелак. Сейбіт абавязкова павінен апрануць чыстую бялізну – каб лён быў чысты. Акрамя таго, вараць курыныя яйкі і кладуць іх у кашолку з насеннем. Прыехаўшы на ніву, сейбіт падкідвае яйкі ўгору, каб лён быў высокі і з буйнымі галоўкамі – галавісты» (Раманаў, 1912. С. 190). Народная культура ўтрымлівае розныя жанры і творы, звязаныя са льном, у якім выяўляўся працэс яго вырошчвання і апрацоўкі, у тым ліку папулярныя карагод «Лянок» і песня «Ох і сеяла Ульяніца лянок». У Рэчыцкім павеце нездарма гаварылі: «Каля святой Алёны гароды ўжо добра зялёны» (Пяткевіч, 1928), таму што сапраўды агародніна да гэтага часу ўзыходзіла.

Народныя звычаі і традыцыі добра сумясціліся з іменем Алёны, якое даў гэтаму дню царкоўны каляндар. Маці імператара Рымскай імперыі Канстанціна, які ў 323 годзе аб'явіў хрысціянскую веру пануючай па ўсім уладарстве, прызначана разам з сынам Роўнаапостальнай за заслугі, што прыраўнены да дзеянняў Хрыстовых апосталаў. Яна ў 326 годзе знайшла крыж Гасподні, а таксама рэшткі трох вяшчуноў, што абвясцілі аб святым вялікім нараджэнні, і здзейсніла шмат іншых гістарычных хрысціянскіх учынкаў .

Тыповым вясеннім святам лічыўся дзень Канстанціна і Алёны (21 мая) у балгар. Акрамя звычайных гулянняў, існаваў у адным з

рэгіёнаў звычай «нести на рство» або гульня «Поогън» – беганне басанож па гарачых вуголлях (КЗ, 1977. С. 290).

Не толькі ўсходнія славяне звязваюць Алёну са льном, але і немцы. «Helene – wachst der Flachs gar schone» (Ярмолаў, 1901. С. 275).

**4/22 Васіліск**. «Ад Васіліска і салавей блізка» (Паўлюкоўскі, 1934), -- сведчыць народна прыкмета, уводзячы у свой каляндар памяць аб святым пакутніку Васіліску, пляменніку вядомага багаслова Ф. Цірона. Два браты Васіліска былі крыжаваны ў час ганенняў Максіміяна, а самому пакутніку пасля адсеклі галаву (каля 308 г.) за учыненыя цуды і непахісную веру ў Хрыста.

Цікава, што нават і ў Сібіры «Василиск – соловьиный день» (Ярмолаў, 1901. С. 275).

**5/23.** Дзень памяці **Ефрасінні Полацкай** (Прадславы) – князёўны, манашкі-асветніцы XII ст. З блізкіх і далёкіх ваколіц людзі пешшу хадзілі ў Полацк пакланіцца «сваёй Ефрасінні» і «абракацца», каб дапамагала ў зямных нягодах (Шумілінскі раён).

Прападобная Ефрасіння (1173 г.) – унучка Полацкага нязя Усяслава Чарадзея, заснавальніца першых школ і летапісных майстэрняў, нябесная заступніца беларусаў. Па яе замове выраблены Святы Крыж, нацыянальная рэліквія Беларусі.

**7/25. Ян.** «Калі рой выйдзе перад Янам, будзе пчаляр панам» (Паўлюкоўскі, 1934). У іншых мясцінах Беларусі гэтую прыкмету адносілі да Яна Купалы.

У царкоўным календары – Трэцяе адшуканне галавы Прадцечы і Хрысціцеля Гасподня Іаана (каля 850 г.)

**Восьмы тыдзень** перад Іллёю. На Смаленшчыне заканчвалі сеяць авёс. Там гаварылі: «Сей авёс, як паявіцца іўсяный камар. Сей авёс, як расцвяцецца казелец. Када суніца красна, ня сей іўса напрасна. Када Фаміна нядзеля будзіць хараша, то і авёс, і ўсякый хлеб будзіць харош. Када на Усяёднай нядзелі ідзець бальшая мяцель, сей авёс раньшы, а мяцелі нет – сей авёс пазней» (Дабравольскі, 1894).

***Дзевятнік** – чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня. Не працавалі ў полі, засцерагаліся грому. Ва ўсходнім Палессі прыкмячаюць: «Трэ коб на Дзевятнік було дзеўяць ягодзін на ветцы» (Тураўскі сл., 1982). Збіраючы ягады, грыбы і арэхі, спявалі песні. З гэтым днем звязваюць рост жыта ў валачобных песнях: Дзевятнік «красу здымаець», «краску кладзець», «красуець», «у пукі бярэць».

Дзевятнік – народная назва свята. Яна ўзнікла ў канцы XIX стагодзя ў гонар пераводу беларускіх уніятаў пад лона праваслаўнай царквы. Католікі і уніяты адзначалі яго як свята Цела Божага. Святар

Іван Берман (1873) сведчыў, што «Тутэйшая заходнеруская царква праводзіць у гэты дзень хросны ход, ставяць бярозкі для упрыгожвання царквы, а прыхаджане прыносяць з сабою на малебен зелле, гэта значыць кветкі, вянкі з траў, якія захоўваюць да Іванавага дню» (Ашмянскі павет).

***Божае Цела (Цела Господня).*** У Віленскай губерні быў зафіксаваны звычай сярод беларусаў-католікаў. «Расстаўленыя ў касцёлах бярозкі ў дзень св. Тройцы ці на свята Цела Господня, старанна збіралі , абломвалі галіны і вадзілі імі па капусце на градах, а потым клалі ў пукі пад снапамі. Верылі, што гэта аберагае капусту ад вусеняў, а хлеб ад мышэй» (Корава, 1861. С. 616).Існуюць народныя паданні.

Восьмы і дзевяты чацвяргі пасля Пасхі ў Румыніі лічыліся цяжкімі і страшнымі. Згодна павер'яў, злыя сілы тады вельмі супрацьдзейнічаюць чалавеку. Таму існавала нямала забаронаў.

У Італіі Corpus Domini («Цела Господняе»). Адзін з самых позніх каталіцкіх святаў быў уведзены папам Урбанам IУ 8 верасня 1264 г., каб адзначаць памяць пра бальсенскі цуд (у царкве г.Бальсена на аблатцы для прычасця выступіла кроў Хрыста).

Асаблівыя святкаванні наглядаюцца ў Іспаніі, бо там шмат стагоддзяў дзень Корпус-крысці (Corpus Christi) быў нацыянальным сімвалам. Даследчыкі не звязваюць яго паходжанне з язычніцкімі традыцыямі, хаця яно стала вельмі развітым, народным, што некаторыя яго элементы царква стала забараняць (КЗ, 1978. С. 40-41).

Нямала ўстойлівых рыфмаваных прыкмет бытуе ў Польшчы: «Jaki dzien jest w Boze Cialo, takich dni potem nie malo» – Які дзень на Божае Цела, такіх потым нямала. «Na Boze Cialo zyto zagescialo» – На Божае Цела жыта зацвіло (Ярмолаў, 1901. С. 298).

*** Дзевятуха** – пятніца на дзвятым тыдні пасля Вялікадня.У Добрушскім раёне лічаць, што Дзевятуха, як і Дзесятуха, гэта свята ад навальніцы, а ў Лельчыцкім кажуць: «Дзевятуха – то польскае сьвято, а Дзесятуха – нашое» (Талстая, 1986). У валачобных песнях побач з Дзесятнікам яна з'яўляецца адным з этапаў росту жыта:

Дзевятушка-памяжаначка
Па межах хадзіла, жытцо абзірала,
Жытцо абзірала да й раўнавала...
Іншы раз святы не размяжоўваліся.

**13/31. Ерамей.** У беларусаў прысвятак вядомы па выслоўю: «Прыйшоў Ерамей – больш не сей» (Цітоў, 1994. С. 163). Рускія яго ведаюць яшчэ як «Еремея Распрягальника».

У царкоўным календары – Апостал ад 70-ці Ерм (I ст.); пакутнікі Ермая (II ст.), Філосаф (III ст.)

***Антоній.*** Апякун гандлю, дзяцей, школьнікаў і абаронца ад злодзеяў. Цікавую гісторыя, звязаную са святым расказаў нам краязнавец Антон Бячко падчас наведвання славутых мірскіх старажытнасцяў.

У цэнтры мястэчка Мір Гродзенскай вобласці знаходзіцца гандлёвая плошча, на супрацьлеглых баках якой – праваслаўная Троіцкая царква ХУІ ст. і Мікалаеўскі касцёл, пабудаваны ў 1599-1605 гадах міласцю фундатара Мікалая Крыштаф Радзівіла Сіроткі. Акрамя таго, што ў тыя часы ў касцёле пад шклом знаходзіўся бівень маманта, увагу наведвальнікаў прыцягваў яшчэ адмысловы алтар з абразам святога Антонія, які, на жаль, не захаваўся. З ім звязаны мясцовыя паданні.

Раней мястэчка славілася сваімі кірмашамі. Асабліва добра ішоў гандаль коньмі. Пакупнікі прыязджалі з Польшчы, Германіі і нават Францыі. Ну і зразумела, там, дзе коні, там не абыходзілася без цыган. Святы Антоній лічыўся апекуном гандлю, яму маліліся і тыя, хто страціў якую-небудзь рэч. Цыгане прыходзілі да св. Антонія 13 чэрвеня, калі ім удавалася ўкрасці каня і выгадна яго збыць, і прымацоўвалі на раме абраза маленькую ўпрыгожаную выяву коніка ў гонар замальвання граху і ахвяравання ў храм Божы. Пасля аднаго здарэння такіх ахвяраў значна павялічылася.

Аднойчы прыйшоў у касцёл селянін, у якога ўкралі жывы тавар, стаў на калені перад абразам святога і давай прасіць: «Святы Антоній, аддай мае коні». А тут побач аказаўся той самы злодзей-цыган. Шкада яму стала чалавека. Падкраўся ён за алтар і адказвае адтуль селяніну: «Ну то ідзі ўжо, аддам, вунь на вуліцы стаяць».

Пагалоска пра гэты выпадак хутка разнеслася па наваколлі. Святому Антонію сталі ахвяраваць усе пацярпелыя ад крадзяжоў. Сёння святы лічыцца апекуном дзяцей і школьнікаў, для якіх у касцёлах у дзень Антонія наладжваюцца святы.

**14/1. Усцін (Юстын і Харытон).** З прысвяткам звязаны прыкметы пра рост збожжавых раслін. «Юсцін цягне ў верх каноплі. Харытон – лён» (Паўлюкоўскі, 1934), «На Усціна лета ўдаецца – жыта добрым коласам нальецца» (Ляснічы, 1990), -- існуюць народныя падказанні. У палякаў у гэты час таксама квітнее жыта: «Na Sw. Wita (15 чэрв.) zboze zakwita» (КЗ. 1983. С. 60).

Царкоўны каляндар падае звесткі на гэты дзень пра пакутнікаў за хрысціянскую веру Іусціна Філосафа і другога Іусціна, і з імі Харытона, Валерыяна і іншых (пам у 166 г.)

**Сёмы тыдзень** перад Іллёю. Пасля аўса браліся сеяць ячмень. Дакладны дзень сяўбы вызначалі па прыкметах. «Сей ячмень, як загудзець сляпень». «Сей ячмень, як каліна ў крузе». «Сей ячмень з

зімы калі рож ня всыпала і яшчэ ячмень у пучках». «Ячмень сей на сядзьмой нядзеле ад святога Іллі, у тэй дзень, када на Усяеднай нядзелі (тыдзень перад Вялікім постам. – А.Л.) была вея («сплашніцы») (Дабравольскі, 1894).

**16/3. Лук'ян.** Паўднёвы вецер на Лук'яна – на добры ўраджай яравых, а калі падзьме паўночна-заходні – сырое лета прынясе (Ляснічы, 1990). У сувязі з тым, што існавала нямала прыкмет, звязаных з ветрам, у Расіі дзень называлі Лук'янам Ветранікам.

У ліку кананізаваных пакутнікаў і святых на гэты дзень царкоўны каляндар змяшчае Лукіліяна (270 – 275 г.) і Лукіяна (81 – 96 г.), якім народнае асэнсаванне магло перайменаваць у Лук'яна.

**20 – 21.** Дзень астранамічнага сонцастаяння.

**21/8. Тодар (Хвёдар).** Па стану надвор'я ў гэты дзень стараліся прадказаць надвор'е і ўраджай на лета: «На Тодара раса – канапель паласа» (Паўлюкоўскі, 1934); «На Тодара раса – лета сухое і ўраджайнае» (Сахараў, 1937); «Навальніца на Хвёдара – падвядзе надвор'е ў час жніва»; «Хвёдар з навальніцай – сенакос спартачаць»; «Росы з Хвёдара – лён уродзіць» (Ляснічы, 1990). У Расіі – Фёдар Летні і Фёдар Калодзежнік (асабіва ў чувашоў).

**22/9. Кірыла.** У некаторых мясцінах адзначаўся як дзень летняга сонцастаяння. Лічылі, што на Кірылу з усяе моцы зямля імкнецца да сонца і пачынаецца лета (Анічэнка, 1992). На Паазер'і да таго дня пачыналі касавіцу (Ляснічы, 1990).

У царкоўным календары два Кірылы – гэта свяціцель, архіепіскап Александрыйскі (444 г.) і прападобны, ігумен Белазерскі (1427 г.)

**23/10.** ***Купала***. «На Купала раса – будуць агуркі»; «У каго Купала пракосы убача – таго баба жнівом не заплача» (БСК, 1937). (Шырэйшае апісанне нацыянальнага свята гл. 6 ліпеня).

**24/11.** ***Ян (Ян Купальны, Янаў дзень)*** – працяг Купалы ў некаторых каталіцкіх раёнах Беларусі. Добра ахарактызаваны ў фальклоры. Беларусы ў Латвіі спявалі:

Ходзіць Ян па вуліцы,
Завець дзяўчат у купаллю:
--Пойдзем дзеўкі ў купаллю,
Пойдзем у зялёну!

*(Сахараў, 1940)*

Пра свята гаварылі: «Калі выйдзець рой перад Янам, будзець зямец панам», «Калі не выліняў конь да святога Яна, няхай ідзець да другога пана» (Барысаўскі павет; Тышкевіч, 1847)); «Яны правяць ільны» (Шырма, 1947); «Святы Ян пчолы садзіць», «Часамі Ян дасць ягад збан», «На Яна сонца гуляе» (БСК, 1937); «На Яна нажала, на

Пятра напякла» (Ашмянскі п.; Шэйн, 1893). Немцы гавораць: «Vor Johannistag man Gerst und Hafer nicht loben mag» – Да Янава дня не хваліся ячменем і аўсом.

**25/12. Анапрэй (Нупрэй)** – прысвятак. Спрыяльны дзень для сяўбы грэчкі. «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ» (Паўлюкоўскі, 1934). У Магілёўскай губерні яшчэ да абеда сеялі «белае зерне» (авёс), а пасля абеду – «чорнае» (грэчку ). Лічылася, што ўжо паспелі суніцы. «Калі суніца красна, не сей аўсу напрасна», гэта значыць, што авёс не паспее да марозаў (Дамбавецкі, 1882). На Смаленшчыне даўней гаварылі: «Святэй Анопры, радзі каноплі» (Дабравольскі, 1894), а ў Свіслацкім раёне зараз кажуць «Анопрэй, сей канопель».

Апроч іншых імён, царкоўны каляндар утрымлівае прападобнага Ануфрыя Вялікага (XV – XVI ст.).

***Дзесятнік** – чацвер на дзесятым тыдні ад Вялікадня, адзін з этапаў даспявання жыта («Дзесятнік гнаі возіць, Дзесятуха косы точыць»).

**26/13. Акуліна (Акуліна Грачышніца, Акуліна Задзярыхвост)** – прысвятак. У некаторых раёнах сеялі грэчку, падрыхтаваўшы глебу на Нупрэя. На Смаленшчыне гэты дзень быў вядомы як «Акуліна Задзярыхвост» ці «Кароўі зык». Тлумачыліся назвы так: на тую пару з'яўляецца шмат аваднеў і каровы на пашы «зыкуюць» – бегаюць, задраўшы хвост (Дабравольскі, 1914).

Па-народнаму Акулінай была празвана хрысціянская пакутніца Акіліна з фінікійскага горада Бібле, што была замучана за веру Хрыста ў 293 годзе.

***Дзесятка (Дзесятуха, Дзесятуха Мучаніца)** – пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня; адзін з этапаў даспявання жыта ( «Дзесятка – жыту пятка», «Дзесятуха зярно поўніць», «Дзесятуха жыта паспявае» -- з валачобных песень). Засцерагаліся маланкі і грому, не працавалі.

«Аброчны» дзень абаронцы свойскай жывёлы. «Абракаліся людзі, шоб худоба не гінула». На Усходнім Палессі праводзілі абрады ля «святых» крыніц, асвячалі з папом ваду ля вадаёмаў з абразам Параскевы (Талстая. С. 115).

***Пяценка.*** Час, калі завязваецца зерне («пятка»). Не мае пастаяннага дня ў календары.

Дзесятуха красу давала,
А Пяцінка красу здымала,
Красу здымала, пятку стаўляла;
А Дзесятуха ды, вой, наліваець,
А святы Іван і ён пятку спяліць...

**28/15. Амос.** За прысвяткам замацавалася прыкмета: прыйшоў Амос – цягне ўгору авёс (Паўлюкоўскі, 1934).

Прарок Амос жыў у VIII стагоддзі да Нараджэння Хрыстова.

**29/16 Ціхан** – прысвятак. На Смаленшчыне гаварылі: «Не поле корміць, а ніва» (Цэбрыкаў, 1862). Зямля прыпавольвае свой рух на арбіце, і ў народзе Ціхан наводзіць асацыяцыі на ціхі дзень. «На Ціхана і пеўчыя птушкі заціхаюць». «На святога Ціхана сонца ледзве дыхае» (Ляснічы, 1990), «ідзе ніжэй» (Анічэнка, 1992).

Царкоўны каляндар на 16 чэрвеня сабраў некалькі Ціханаў: свяціцеля, епіскапа Амафунтскага (425 г.), прападобнага Калужскага (1492 г.) і Лухаўскога (1503 г.), што быў родам з Літоўскага княства.

*Пятро і Паўла (Пятрок).* Земляробчае свята. Характэрныя прыказкі і прыкметы: «Святы Пётра ў косы звоніць, а святы Паўла граблі робіць»; «Калі на Пятра пойдзе дождж – жыта, як хвошч; уродзіць мятліца – хлеба палавіца; зарадзіў званец – жыту канец;»; «Калі зязюля будзе кукаваць да Пятра – восень харошая, а калі на Пятра – лета доўгае і харошае, снег ня хутка выпадзе»; «Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйдзе Ілля опадуць і два, а па Ўсіх Святых – ня будзе іх» (БСК, 1937).

Святкаванне Пятра ў беларусаў-католікаў мала чым вылучаецца: праводзяцца такія ж масавыя гульні з танцамі і песнямі, наладжваннем арэляў, як у праваслаўных (гл. 12 ліпеня).

**30/17. *Данат.*** Католікі-беларусы Латвіі захавалі памяць аб ім у валачобнай песні, як сведчыць запіс 1940 г. С. Сахарава з Каплаўскай воласці Ілукстэнскага павету:

"Святы Данат коскі точыць,
Сянцо косіць, Бога просіць:
"Дай жа, Божа, ды на нашу
На работку ды пагодку..."

У аўстрыйцаў атрыбутам святога Даната, якога адзначалі 30 чэрвеня, быў сноп.